ПОЎНАСЦЮ ЗАБАРАНІЦЬ ЯДЗЕРНЫЯ ВЫПРАБАВАННІ

Выступленне кіраўніка дэлегацыі Беларускай ССР К. В. КІСЯЛЁВА на пасяджэнні Палітычнага камітэта XX сесіі Генеральнай Асамблеі ААН па пытанню аб поўнай забароне выпрабаванняў ядзернай зброі 25 лістапада 1965 года

Савецкі Саюз выступае за забарону ўсіх без выключэння выпрабаванняў ядзернай зброі, за распаўсюджанне дзеяння Маскоўскага дагавору і на падземныя ядзерныя выпрабаванні. У гэтым пытанні Савецкі Саюз выходзіць з таго, што забарона падземных выпрабаванняў, як і выпрабаванняў у іншых асяроддзях, можа эфектыўна кантраляваць шляхам нацыянальных сродкаў выяўлення і кантролю, і для гэтага не патрэбна ніякая міжнародная інспекцыя.

«Савецкі ўрад,—указваецца ў мемарандуме ад 28 студзеня 1964 года,—гатоў неадкладна дагаварыцца аб забароне таксама і падземных выпрабаванняў ядзернай зброі на аснове выкарыстання нацыянальных сродкаў выяўлення і кантролю за такой забаронай».

Навуковыя даследаванні поўнасцю пацвердзілі, што для выяўлення выпрабаванняў ядзернай зброі пад зямлёй, гэтак жа як і ў атмасферы, космасе і пад вадой, не патрабуецца арганізацыі спецыяльнага міжнаіх выкарыстання для правядзення разведкі на тэрыторыі Савецкага Саюза.

Як вядома, у Камісіі ААН па раззбраенню, дзе абмяркоўваліся таксама праблемы забароны ўсіх ядзерных выпрабаванняў, ніякіх змяненняў пазіцыі асноўных груп дзяржаў па гэтаму пытанню не адбылося. Нейтралісцкія краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі патрабавалі пашырэння Маскоўскага дагавору на падземныя ядзерныя выбухі. Прадстаўнікі Савецкага Саюза, Беларускай ССР і іншых сацыялістычных краін выступалі за забарону падземных ядзерных выпрабаванняў на аснове выкарыстання нацыянальных сістэм выяўлення. Прадстаўнікі заходніх краін, у першую чаргу Злучаных Штатаў, фармальна выступаючы ў карысць забароны гэтых выпрабаванняў, працягвалі настойТакая карціна з ядзернымі выпрабаваннямі на сённяшні дзень.

Беларуская ССР выступала і выступае цяпер за забарону ўсіх без выключэння выпрабаванняў ядзернай зброі. Рашуча падтрымліваючы пазіцыю Савецкага Саюза, які лічыць зусім дастатковым нацыянальныя сродкі кантролю, мы выходзім з існуючай практыкі, мы ўлічваем навукова-тэхнічныя дасягненні, якія дазваляюць амаль беспамылкова выяўляць і распазнаваць ядзерныя выпрабаванні пад зямлёй. Мінулыя гады поўнасцю пацвердзілі правільнасць тых прынцыпаў, якія ляглі ў аснову Маскоўскага дагавору. Гэта датычыць і прынцыпаў кантролю. Пацвярджэннем гэтаму служыць тая неаспрэчная акалічнасць, што ўсё большая колькасць дзяржаў патрабуе забараніць падземныя ядзерныя выпрабаванні на падставе прынцыпа

лася б, што савецкія прапановы ўказвалі шлях да забароны ядзерных выпрабаванняў, але, не жадаючы спынення ядзерных выпрабаванняў, ЗША і Англія не праявілі нават мінімуму добрай волі. Беларуская дэлегацыя лічыць, што, нягледзячы на ўсе намаганні Савецкага Саюза, іменна па віне заходніх дзяржаў не ўдалося дагаварыцца аб спыненні выпрабаванняў ядзернай зброі на вечныя часы. Цяпер ЗША ўзмоцнена імкнуцца стварыць «шматбаковыя ядзерныя сілы НАТО» і аснасціць ядзернай зброяй заходнегерманскіх рэваншыстаў, таму яны зацікаўлены ва ўдасканаленні ядзернай зброі. Вось чаму Злучаныя Штаты шукаюць усякія пралазы, каб зацягнуць вырашэнне пытання аб спыненні выпрабаванняў ядзернай зброі або ўвогуле пазбегнуць яго вырашэння.

Дэлегацыя Беларускай ССР, кіруючыся прынцыпамі мірнага суіснавання дзяржаў з розным грамадскім ладам, імкнучыся прадухіліць сусветную тэрмаядзерную вайну, настойліва і паслядоўна дабіваецца

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы